Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся

ГІДРА-МЭТЭОРОЛЕГІЧНЫ КАМІТЭТ

пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ГІДРА-МЭТІНСТЫТУТУ

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Гідра-мэтэоролёгічны Інстытут. Тэл. 17-93

№ 8 (121) | 11—20 сакавіка | 1933 г.

ЗЬМЕСТ

СЫНОПТЫЧНЫ АГЛЯД

Пачатак дэкады насіў выразны зімовы характар амаль па ўсёй тэрыторыі Эўропейскай часткі Саюзу.

Паўднёвую палову тэрыторыі займала арктычнае паветра, тэмпэратуры якога зранку даходзілі да —22°; у паўночнай палове знаходзіліся ўмерана халодныя масы контынэнтальна-полярнага паветра.

Адзначаны расклад паветраных мас, як у той, так і ў другой палове, захоўваецца на працягу першых 2 дзён дэкады.

У наступныя дні ў паўднёвай палове Эўропейскай тэрыторыі Саюзу вызначаецца пераход на веснавыя процэсы.

Да 15-га ліку тут адбываецца паступовая зьмена арктычных мас прагрэтымі контынэнтальна-полярнымі масамі, струмень якіх рушыцца з цэнтральнай Эўропы, дзе вызначыўся процэс антыцыклёнагенэза.

Па меры пранікань ня контынэнтальна-полярнага паветра к усходу ўздоўж паўднёвай паловы ўзмацняецца таяньне сьнегавога насьцілу. Асабліва спрыяючыя да гэтага ўмовы складаюцца э пачатку другой паловы дэкады, калі нават уначы пры ясным небе тэмпэратуры паветра не апускаюцца ніжэй нуля градусаў.

Пры значнай сонечнай дзейнасьці процэс сьнегатаяньня прымае сталы характар. Нарэшце, у канцы дэкады сьнегавы насьціл зьнікае ў раёнах басэйна Дона, Дняпра і Зах. Дзьвіны.

Табліца вынікаў мэтэоролёгічных наз

Кліматычныя раёны	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпэратура паветра															
			11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сярэдняя	Нормальн.	Максым.	Мінімальн.	Чысло калі не [illegible] мін.
(Вазерны)	2	Дрыса [1] . .	—12	0	0	1	0	2	4	7	4	5	—	1	—	11	—21	11
	3	Полацак [2] . .	—11	0	1	1	1	2	5	7	5	5	—	1	—2	10	—22	11
	68	Гарадок [3] . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва [4] . . .	—9	—3	0	0	0	1	4	5	4	3	—	0	—3	9	—24	11
(Водападзельны)	8	Лепель . .	—2	—1	0	1	0	1	3	6	3	4	—	1	—	10	—22	11
	15	Сянно . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы [5].	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр [6] . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў [7]. .	—11	—3	2	2	1	3	5	7	6	4	—	2	—2	13	—17	11
	16	Менск [8] . .	—10	—2	2	2	2	3	4	6	5	5	—	2	—2	12	—15	11
	93	Бярэзіна [9] . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка [10]	—9	—6	0	0	1	3	5	6	6	4	—	1	—1	12	—	—
	25	Асіпавічы [11] .	—6	—6	1	—1	2	3	6	7	7	5	—	2	—1	14	—17	12
	10	Ворша [12] .	—9	—6	1	2	2	2	4	5	5	4	—	1	—2	9	—14	11
	19	Горкі [13] . . .	—10	—7	1	2	1	1	4	4	4	2	—	0	—3	8	—21	12
(Раўнінны)	89	Клічаў . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак [14] .	—8	—5	—1	0	1	2	5	7	5	5	—	1	—	13	—19	12
	119	Ратміравічы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар.-Сосны [15].	—6	—5	0	2	3	4	8	7	5	7	—	2	—1	15	—16	12
	21	Магілеў [16] .	—9	—7	1	3	2	2	5	5	5	3	—	0	—2	10	—18	12
	73	Чавусы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў [17] .	—7	—5	0	2	2	2	4	5	4	2	—	1	—2	10	—13	12
	71	Касьцюковічы [18] . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск [19] . .	—9	—4	0	1	2	3	4	4	4	3	—	1	—2	10	—8	12
	32	Жлобін . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
(Палескі)	33	Жыткавічы [20].	—6	—4	0	2	3	4	8	8	7	5	—	3	0	15	—8	12
	37	Калінкавічы .	—	—	—4	0	3	4	8	6	5	5	—	2	—1	13	—10	12
	39	Лельчыцы . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск [21] .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба [22] . .	—7	—9	—1	0	2	2	5	5	5	2	—	0	—	8	—	12
	38	Гомель [23]. .	—6	—10	—1	2	3	3	5	5	5	2	—	1	—2	12	—19	12
	35	Васілевічы .	—6	—7	0	2	2	4	7	5	5	5	—	2	—1	12	—19	12
	40	Людвінава [24] .	—9	—4	—2	1	2	3	4	4	4	3	—	4	0	10	—16	12
	242	Красілаўка .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

[...]АГІ: [1] туман (20); [2] туман (11, 16); [3] туман (12, 16); [4] туман (11, 12); [5] туман (11); [6] туман
[12] туман (13, 14); [13] туман (13, 14, 15, 20); [14] туман (12, 20); [15] туман (11, 14, 15), моцн.
(14, 15); [21] туман (20); [22] туман (11); [23] туман (11, 12, 13, 20); [24] туман (15, 20).

x назіраньняў за 11—20 сакавіка 1933 г.

(…калі на гл. мін.)	Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпэратура паверхні глебы: Максым.	Мінімальн.	Чысло, калі на гл. мін.	Ападкі ў мм: 11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сума	Сьнегавы насьціл: Вышыня ў см.	Шчыльнасьць	Характарысты сьнегавога насьцілу
11	80	—	—	—	0.1	4.0	..	..	0.2	..	3.0	..	0.1	..	—	7.4	0	—	—
11	72	—	—	—	0.5	1.0	..	..	3.0	0.4	0.4	..	1.0	..	—	6.3	—	—	—
—	—	—	—	—	..	0.1	..	..	3.0	..	2.0	..	..	..	—	5.1	19	—	сьнег мясцамі
—	—	—	—	—	..	..	..	..	..	7.0	..	1.0	..	..	—	8.0	0	—	·
11	68	10	−19	11	..	..	..	..	1.0	..	..	..	..	..	—	1.0	22	—	·
11	81	—	—	—	..	0.1	..	..	0.4	..	1.0	..	..	..	—	1.5	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	0.3	0.1	..	..	2.0	1.0	..	..	..	..	—	3.4	—	—	—
—	—	—	—	—	0.2	0.1	0.1	0.1	3.0	0.1	0.1	0.1	..	0.1	—	3.9	0	—	сьнег мясцамі
11	67	—	—	—	0.1	0.3	..	..	1.0	2.0	..	..	..	..	—	3.4	—	—	—
11	69	15	−21	11	1.0	1.0	..	..	0.3	1.0	..	..	..	..	—	3.3	0	—	сьнег мясцамі
—	—	—	—	—	..	..	..	..	0.2	..	..	..	..	..	—	0.2	0	—	·
—	69	—	—	—	..	..	..	..	..	1.0	2.0	..	..	..	—	3.0	—	—	—
12	62	—	—	—	..	..	..	..	1.0	1.0	..	..	..	..	—	2.0	—	—	—
11	75	—	−15	11	..	0.1	..	..	0.4	..	..	..	..	..	—	0.5	—	—	—
12	77	8	−25	12	..	0.1	0.1	..	1.0	0.1	..	..	0.1	..	—	1.4	0	—	сьнег мясцамі
—	—	—	—	—	0.1	0.6	0.1	0.1	1.0	0.2	..	..	..	..	—	2.1	—	—	—
12	70	—	—	—	..	0.1	..	..	..	..	..	..	..	..	—	0.1	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
12	—	—	—	—	0.1	..	..	0.2	..	..	..	..	..	..	—	0.3	—	—	—
12	69	—	—	—	..	0.4	..	..	0.2	0.4	..	..	..	..	—	1.0	0	—	сьнег мясцамі
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
12	—	—	—	—	..	1.0	..	..	1.0	..	..	..	..	..	—	2.0	10	—	сьнег мясцамі
—	—	—	—	—	0.1	0.1	..	..	0.5	0.1	..	..	0.1	0.1	—	1.0	10	—	·
12	70	18	—	—	..	..	..	..	1.0	2.0	..	..	..	..	—	3.0	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
12	67	—	—	—	..	0.3	..	..	0.1	..	..	..	..	..	—	0.4	—	—	—
12	62	—	—	—	..	..	..	..	..	0.1	..	..	..	..	—	0.1	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	..	..	..	..	1.0	2.0	..	..	..	..	—	3.0	0	—	сьнег мясцамі
12	—	7	−20	12	..	..	..	..	..	2.0	..	..	..	..	—	2.0	—	—	—
12	70	—	—	—	..	0.1	..	..	..	1.0	..	..	..	0.1	—	1.2	—	—	—
12	57	—	—	—	..	..	..	..	..	0.6	..	..	..	..	—	0.6	—	—	—
12	67	17	−21	12	0.1	0.1	..	0.1	..	0 2	0.1	..	0.2	0.1	—	0.9	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

ан
дн.

(12); [7] туман (11, 14, 15, 17, 18); [8] туман (12); [9] туман (11); [10] туман (13), град (16); [11] туман (1
вецер (15); [16] туман (12, 20); [17] туман (13, 10); [18] туман (19, 20); [19] туман (14, 20); [20] тум

Табліца вынікаў мэтэоролёгіч.назіраньняў за 11—20 сакавіка 1933 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасьць	Вецер: З максым. хуткасьцю: Напрамак	Вецер: З максым. хуткасьцю: Хуткасьць	Інсоляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасьць у 10-балавай сыстэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасьць у 10-балавай сыстэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхнёвага пласту глебы (на глыбіні 10—15 см)
I Паўночны (Вазёрны)	2	Дрыса	W	4	E	9	—	9	8	вільготная
	5	Полацак	W	4	S	6	—	8	8	„
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	„
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	„
	7	Нова-Каралёва	SW	6	W	12	26	8	8	незамерзл., засл. сьнегам
II Пераходны (Вадападзельны)	8	Лепель	SW	4	SW	6	—	8	3	вільготная
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	замерзлая
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	13	Барысаў	W	4	SW	14	—	8	5	„
	16	Менск	W	2	NW	9	—	8	5	„
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	„
	23	Мар'іна-Горка	S	6	SW	20	—	5	3	„
	25	Асіпавічы	W	4	W	6	—	8	2	„
	10	Ворша	W	4	SW	6	—	8	7	„
	19	Горкі	W	4	W	9	—	8	5	„
III Цэнтральны (Раўніны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	„
	28	Слуцак	W	4	W	9	—	5	5	„
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар'іна-Сосны	W	4	W	17	—	5	5	вільготная
	21	Магілеў	W	4	S	6	—	8	5	„
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	SW	4	SW	9	—	8	8	незамерзл., засл. сьнегам
	71	Касьцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	замерзлая
	31	Турск	W	4	W	9	—	5	5	вільготная
	32	Жлобін	—	—	—	—	—	—	—	—
IV Паўднёвы (Нізіны)	33	Жыткавічы	W	4	W	6	—	5	3	вільготная
	37	Калінкавічы	W	4	W	5	—	5	3	„
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	замерзлая
	83	Барба	SW	4	S	9	—	5	5	вільготная
	38	Гомель	S	4	S	5	—	5	5	„
	35	Васілевічы	SW	4	SW	6	44	5	5	„
	40	Людвінава	SW	6	W	9	—	3	2	„
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—

На абшарах паўночнай паловы Эўрапейскай тэрыторыі Саюзу наглядаецца струмень марскіх полярных мас. Ён адбываецца па пэрыфэрыі заходня-эўропейскага антыцыклёну праз Скандынавію і Балтыцкае мора.

12-га ліку марскія полярныя масы дасягаюць раёну вазёр, дзе на фронтальным падзеле ўтвараецца цыклёногенэз. Нарэшце, на працягу наступных 2-х дзён паўночную палову ахапляе абшырны цыклён, у тыл якога праз тэрыторыю паўночнага края і Фэноскандыю ўваходзяць сьвежыя арктычныя масы.

Адзначаны цыклён 16-га ліку пераваливае за Урал, але процэс пранікањньня марскіх полярных мас к усходу з пасьлядоўным уваходжаньнем арктычнага паветра ў тыл паўтараецца з 15-га ліку па 18-е.

Гэты процэс выяўляецца рухам другога цыклёна з Норвэскага мора на паўночны Урал.

Такім чынам, зімовы характар надвор'я ў паўночнай палове затрымліваецца да канца дэкады.

У апошні дзень цёплае контынэнтальна-полярнае паветра з тэмпэратурамі да $+2^{\circ}$ пранікае з паўднёвай паловы да басэйна Паўночнай Дзьвіны.

Тэрыторыя БССР у выніку прамежкавага становішча часамі знаходзілася пад уплывам процэсаў, якія адбываліся ў паўночнай палове Эўропейскай тэрыторыі Саюзу; але пераважны ўплыў належыў процэсам паўднёвай паловы.

З пачатку дэкады нашу краіну займалі арктычныя масы, якія ўвайшлі на тэрыторыю ў сувязі з папярэднім хваляваньнем каля яе меж.

Ападкі першага дня дэкады зьвязаны з ліквідаваньнем гэтае хвалі.

У наступны дзень з паўночнага захаду насоўваецца фронт марскога полярнага паветра, выклікаючы ападкі.

13-га і 14-га на тэрыторыю краіны ўваходзяць контынэнтальна-полярныя масы, якія прыносяць значнае пацяпленьне, галоўным чынам, за кошт сонечнай дзейнасьці, у выніку якой дзенныя тэмпэратуры даходзяць да $+6$, $+7$ градусаў.

У краіне пачынаецца сталае сьнегатаяньне, якое працягваецца ў наступныя дні. З 15-га па 17-е ў краіну ізноў пранікаюць марскія полярныя масы з павялічэньнем воблачнасьці і з ападкамі ў выніку прасоўваньня шэрага франтоў. Найбольш значнае пацяпленьне і адпаведнае сьнегатаяньне адбыліся ў апошнія тры дні, калі краіну ізноў занялі контынэнтальна-полярныя масы.

У выніку нязначнай воблачнасьці ў гэтыя дні адбываецца значнае награваньне паветра ўдзень (звыш $+12^{0}$). Пры гэтакіх тэмпэратурных умовах праходзіць канчатковае зьнішчэньне сьнегавога насьцілу па ўсёй краіне і пачатак руху вясновае вады.

Л. Садоўскі.

Мэтэоролёгічная характарыстыка за 11—20 сакавіка 1933 г.

У гэтую дэкаду адбылася вельмі рэзкая і значная зьмена ў надвор'і. У першы дзень дэкады па ўсёй БССР вельмі нізкія т-ры ад 6° да—12°, на другі дзень БССР пачынае захапляць пацяпленьне, якое ідзе з паўночнага захаду, т-ра за адны суткі мясцамі падвышаецца на 10°, 13-га пацяпленьне захапіла ўжо ўсю БССР, т-ры робяцца дадатнымі і ўсё падвышаюцца.

К 18-му яны дасягаюць 5—8 град. У апошнія дні т-ра некалькі паніжаецца. Сярэдняя дэкадная т-ра хістаецца ад 0° да 4°, што прыблізна на 3° вышэй нормальнай.

Максымальная т-ра мясцамі дасягала значных вялічынь: 10—15°. Мінімальная т-ра мясцамі была ніжэй—20°, але паўсюды мінімум наглядаўся ў 1-ы або ў 2-ы дзень.

Ападкі выпалі ў невялікай колькасьці. У паўночнай зоне некалькі больш 5 мм, у астатніх-жа менш 5 мм. Выпадалі яны ў першыя два дні і галоўным чынам 15-га, 16-га, апошнія-ж дні дэкады былі пераважна без ападкаў.

У выніку значнага пацяпленьня і ападкаў у выглядзе дажджу (15-га і 16-га) паўсюды наглядаецца інтэнсыўнае таяньне сьнегавога насьцілу. У канцы дэкады большасьць станцый адзначае поўнае зьнікненьне сьнегу, некаторыя-ж адзначаюць мясцамі астачы сьнегу.

Вятры пераважалі заходнія з адхіленьнем на поўдзень. Сярэднія хуткасьці умераныя, 4—6 м/сэк. Максымальныя хуткасьці мясцамі дасягалі значных вялічынь да 17—20 м/сэк.

Воблачнасьць у паўночнай палове БССР складала каля 80% агульнага пакрыцьця неба, у паўднёвай-жа 50%.

У першыя дні дэкады і ў апошні паўсюды наглядаліся туманы.

Н. Малішэўская.

З загаду № 27 ад 22/III 1933 г.

§ 5.

Назіральніка мэтстанцыі Асіпавічы т. Раеўскага за прагул, зроблены 14/III-33 г., дрэнныя адносіны да дзяржаўнай маемасьці—зволіць з працы з 14/III-33 г. бяз выдачы выходнай дапамогі, утрымаўшы з зарплаты каштоўнасьць разьбітых ім па нядбайнасьці 2-х дажджамерных стаканаў у суме 5 руб. і за пакрадзены ножык 6 руб. Усяго вылічыць з зарплаты 11 руб.

Назіральніцы мэтстанцыі Асіпавічы т. Зінкевіч за ўход з працы 14/III-33 г., не дачакаўшыся замены, без папярэдняга паведамленьня загадчыка аб уходзе, у выніку чаго быў зроблен пропуск назіраньняў за 13 гадз.,—аб'явіць вымову з папярэджаньнем.

§ 6.

Назіральніцу мэтст. Менск т. Метор за сыстэматычны ўход з працы ў час дзяжурства і нядбайныя адносіны да працы зволіць з працы з 20/III-33 г. бяз выдачы выходнай дапамогі.

Нам. дырэктара ГМІ Галкін.

Адказны рэдактар **М. Л. Лейвікаў.**

Менск. Друк. БАН. Заказ № 4362. Гарліт № 1263. Тыр. 1000 экз. 7 стар.